**Смалявіцкі раённы**
**Савет дэпутатаў**

**Смолевичский районный**
**Совет депутатов**

## РАШЭННЕ

## РЕШЕНИЕ

_______________ № _______

г. Смалявічы

г. Смолевичи

Аб зацвярджэнні Рэгіянальнай праграмы па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей Смалявіцкага раёна на 2013-2015 гады

На падставе падпункта 1.1 пункта 1 артыкула 10 Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» Смалявіцкі раённы Савет дэпутатаў ВЫРАШЫЎ:

1. Зацвердзіць прыкладзеную Рэгіянальную праграму па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей Смалявіцкага раёна на 2013-2015 гады.

2. Кантроль за выкананнем дадзенага рашэння ўскласці на намесніка старшыні Смалявіцкага раённага выканаўчага камітэта па накірунку дзейнасці.

3. Дадзенае рашэнне ўступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Старшыня А.А.Ляхоўскі

ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне
Смалявіцкага раённага
Савета дэпутатаў
_______________ №______

# РЭГІЯНАЛЬНАЯ ПРАГРАМА
па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей Смалявіцкага раёна на 2013–2015 гады

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэгіянальная праграма па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей Смалявіцкага раёна на 2013–2015 гады (далей – Праграма) распрацавана на падставе Закона Рэспублікі Беларусь ад 9 студзеня 2006 года «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» (Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь, 2006 г., № 9, 2/1195).

2. Заказчык і каардынатар Праграмы – Смалявіцкі раённы выканаўчы камітэт.

3. Распрацоўшчык Праграмы – аддзел культуры Смалявіцкага раённага выканаўчага камітэта.

4. Фінансаванне Праграмы – за кошт сродкаў мясцовага бюджэту, уласнікаў гісторыка-культурных каштоўнасцей і іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Крыніцы і аб'ёмы фінансавання ўдакладняюцца штогод.

5. Выкананне функцый у галіне аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей, забеспячэнні ўліку і захаванасці ўскладзена на начальніка аддзела культуры Смалявіцкага раённага выканаўчага камітэта.

6. Кантроль за пытаннямі забеспячэння арганізацыі выканання заканадаўства аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей выконвае намеснік старшыні Смалявіцкага раённага выканаўчага камітэта.

## ГЛАВА 2
## ТЭХНІКА-ЭКАНАМІЧНАЕ АБГРУНТАВАННЕ ПРАГРАМЫ

1. На тэрыторыі раёна знаходзіцца 22 помнікі унесенных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Сярод якіх 12 помнікаў гісторыі, 7 помнікаў археалогіі, 3 помнікі архітэктуры.

2. Гісторыка-культурныя каштоўнасці з'яўляюцца:

адным з фактараў фарміравання нацыянальнага менталітэту;

рэдкім каштоўным сведчаннем гісторыі рэгіёна;

матэрыяльным аб'ектам або нематэрыяльным праяўленнем творчасці чалавека з захаваннем асаблівасцяў ладу жыцця, характэрных толькі для культуры рэгіёна;

дакументальнай фіксацыяй, сімвалам або іншым праяўленнем ці абазначэннем з'яў, падзей або працэсаў, якія звязаны з гісторыяй рэгіёна;

аб'ектам ушанавання славутых людзей, воінаў, змагароў, якія загінулі за высакародную справу, а таксама ахвяраў ваенных падзей, узброеных канфліктаў.

3. Гісторыка-культурныя каштоўнасці непасрэдна звязаны з падзеямі або ідэямі і перакананнямі, якія аказалі значны ўплыў на ход гістарычнага, культурнага і духоўнага развіцця асобы і сацыяльнай культуры рэгіёна.

Гісторыка-культурныя каштоўнасці цесна звязаны з народнымі абрадамі.

4. Гісторыка-культурныя каштоўнасці аказалі і аказваюць значны ўплыў на развіццё мастацтва, духоўнасць грамадства, светапогляд людзей у пэўны гістарычны перыяд на тэрыторыі рэгіёна.

5. Вышэйадзначанае сведчыць аб неабходнасці зберажэння для нашчадкаў і папулярызацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей Смалявіцкага рэгіёна, актывізацыі іх выкарыстання ў справе духоўнага выхавання, уключэння іх у кола мясцовых гісторыка-культурных і турыстычных аб'ектаў, прадстаўляючых цікавасць для карэнных жыхароў, гасцей і наведвальнікаў Смалявітчыны як узор самабытнасці, сведчанне багатага гістарычнага мінулага і лёсавызначальных з'яў і падзей, этнаграфічнай разнастайнасці побытавых традыцый.

## ГЛАВА 3
## МЭТА, ЗАДАЧЫ І ПАКАЗЧЫКІ ПРАГРАМЫ

1. Мэта Праграмы – захаванне, улік, папулярызацыя і аднаўленне матэрыяльных і нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей Смалявітчыны.

2. Задачы Праграмы:

забеспячэнне даступнасці гісторыка-культурных каштоўнасцей усім слаям насельніцтва;

складанне ўліковых дакументаў;

стварэнне электроннага банка даных уласнай генерацыі гісторыка-культурных каштоўнасцей Смалявіцкага раёна;

рэалізацыя мерапрыемстваў рэстаўрацыі, рэканструкцыі і захавання гісторыка-культурных каштоўнасцей, уключэнне іх у культурны і гістарычны абарот;

вызначэнне і аднаўленне найбольш значных гістарычных аб'ектаў для выкарыстання іх у якасці аб'ектаў культурна-дасугавай дзейнасці;

уключэнне аб'ектаў гісторыка-культурных каштоўнасцей у сферу турысцкай дзейнасці;

выкарыстанне аб'ектаў гісторыка-культурных каштоўнасцей для пазнавальных, адукацыйных і прапагандысцкіх мэт;

каардынацыя ўсіх службаў і ведамстваў, якія маюць дачыненне да зберажэння гісторыка-культурных каштоўнасцей раёна;

выяўленне нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, якія могуць уяўляць гісторыка-культурную каштоўнасць, іх вылучэнне для надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.

3. Эфектыўнасць рэалізацыі задач Праграмы вызначаецца дасягненнем паказчыкаў згодна з дадаткам да Праграмы, якія прадстаўлены па гадах на працягу ўсяго тэрміну яе рэалізацыі.

Дадатак
да Рэгіянальнай
праграмы па ахове
гісторыка-культурных
каштоўнасцей
Смалявіцкага раёна на
2013–2015 гады

## План мерапрыемстваў па рэалізацыі Рэгіянальнай праграмы па ахове гісторыка-культурных каштоўнасцей Смалявіцкага раёна на 2013–2015 гады

| № п/п | Назва мерапрыемства | Выканаўцы | Тэрмін выканання (гады) | Крыніцы фінансавання | Плануемыя аб'ёмы расходаў, млн. рублёў |
|---|---|---|---|---|---|
| Складанне ўліковых дакументаў | | | | | |
| 1 | Пераафармленне пашпартоў на матэрыяльныя аб'екты гісторыка-культурных каштоўнасцей | Уласнікі аб'ектаў гісторыка-культурных каштоўнасцей | 2013 | Мясцовы бюджэт, сродкі ўласнікаў | У межах выдзеленых сродкаў |
| 2 | Стварэнне электроннага рэестра гісторыка-культурных каштоўнасцей Смалявіцкага раёна | Аддзел культуры Смалявіцкага раённага выканаўчага камітэта (далей – райвыканкам) | 2013 | – | – |
| 3 | Нанясенне аб'ектаў гісторыка-культурных каштоўнасцей на карты Смалявіцкага раёна | Землеўпарадчая служба райвыканкама | 2013 | Мясцовы бюджэт | У межах выдзеленых сродкаў |
| Удасканаленне ахоўнай справы | | | | | |
| 4 | Распрацоўка праектнай дакументацыі зон аховы на матэрыяльныя аб'екты гісторыка-культурных каштоўнасцей:<br>7 помнікаў археалогіі – гарадзішчы<br>курганныя магільнікі<br>3 – помнікі архітэктуры | Уласнікі аб'ектаў гісторыка-культурных каштоўнасцей | 2013<br>2014<br>2015<br>2015 | Мясцовы бюджэт<br>Мясцовы бюджэт<br>Сродкі ўласніка<br>Сродкі ўласніка | У межах выдзеленых сродкаў |
| Захаванне і аднаўленне | | | | | |
| 5 | Забеспячэнне добраўпарадкавання тэрыторыі вакол аб'ектаў гісторыка-культурных каштоўнасцей | Уласнікі аб'ектаў гісторыка-культурных каштоўнасцей | Па меры неабходнасці | – | – |
| 6 | Касметычны рамонт помнікаў гісторыі | Уласнікі аб'ектаў помнікаў гісторыі | Штогод (да Дня Перамогі) | Мясцовы бюджэт | У межах выдзеленых сродкаў |
| 7 | Рэстаўрацыя помніка архітэктуры 18 стагоддзя – Благавешанская царква. Манастырскі корпус (в.Ляды) | Уласнік аб'екта | 2013–2015 | Сродкі ўласніка | У межах паступаючых сродкаў |
| 8 | Рэстаўрацыя садова-паркавага ансамбля сярэдзіны 19 века (в.Шыпяны) | Уласнік аб'екта | 2013–2015 | Сродкі ўласніка | У межах паступаючых сродкаў |
| Уключэнне ў сферу турысцкай дзейнасці | | | | | |
| 9 | Уключэнне ў культурны і | Уласнік аб'екта | 2014-2015 | - | - |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | турыстычны абарот помніка архітэктуры – манастыр Базылян: а)Благавещанская царква; б)Манастырскі корпус(в.Ляды); | | | | |
| Каардынацыя | | | | | |
| 10 | Правядзенне раённых семінараў для прадстаўнікоў сферы дзейнасці, якія закранаюць пытанні аховы гісторыка-культурнай спадчыны | Аддзел культуры райвыканкама | Штогод | – | – |
| 11 | Правядзенне маніторынгу стану помнікаў, уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь | Аддзел культуры райвыканкама сумесна з зацікаўленымі | Штогод | – | – |
| 12 | Вынясенне на разгляд раённага і сельскіх выканаўчых камітэтаў пытанняў па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, выканання уласнікамі закона РБ “Аб ахове гісторыка-культурнай | Аддзел культуры райвыканкама, сельскія выканаўчыя камітэты | Штогод | – | – |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | спадчыны РБ” ад 09.01.2006 №983 | | | | |
| Папулярызацыя гісторыка-культурных каштоўнасцей | | | | | |
| 13 | Выпуск інфармацыйнага сборніка «Помнікі і памятныя мясціны Смалявічыны» | Смалявіцкая раённая бібліятэка ім.М.Багдановіча | 2014 | – | – |
| 16 | Выпуск паказальнікаў серыі «Помнікі і памятныя мясціны Смалявічыны»: “Вогненныя вескі Смалявітчыны”; “Вянок лягенд Смалявітчыны”; | Смалявіцкая раённая бібліятэка ім.М.Багдановіча | 2014 | – | – |
| 17 | Выпуск слайд-прэзентацыі «Памяць, закаваная ў граніт: віртуальная экскурсія па месцах памяці загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Смалявіцкага раёна» | Рабочая група па стварэнню музея. | 2013 | – | – |
| 18 | Арганізацыя мітынгаў па ўшанаванні памяці загінуўшых у гады Вялікай Айчыннай вайны | Аддзел ідэалагічнай работы райвыканкама, сельскія выканаўчыя камітэты, установы адукацыі і культуры | Штогод (да Дня Перамогі) | – | – |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 19 | Правядзенне масавых мерапрыемстваў: краязнаўча-патрыятычных гадзін і інфармацыйных хвілін «А памяць священна»... «Ради жизни на земле»; «Наша гордость, наша слава»; «Подвиг вошедший в века»; «Маршрутами памяти» | Сельскія бібліятэчныя ўстановы, установы адукацыі | Штогод (да знамяналь-ных і памятных дат) | – | – |
| 20 | Правядзенне экскурсійных трыбун з уключэннем матэрыялаў аб памятных і гістарычных мясцінах Смалявіцкага раёна | Аддзел ідэалагічнай работы райвыканкама, бібліятэчныя ўстановы раёна | Па заяўках арганіза-цый і ўстаноў | – | – |